Саша Кузьміч

Аналітычная запіска
Дынаміка змену коштаў на вышэйшую адукацыю ў Беларусі у 2017-2020 г.г.

У рыторыцы дзяржаўных органаў і ў турыстычных даведніках часта прыводзіцца статыстыка колькасці людзей з вышэйшай адукацыяй на душу насельніцтва як пацверджанне даступнасці вышэйшай адукацыі.

Таксама ў дакуменце Міністэрства адукацыі Беларусі ад 29.11.2017 №742 “Канцэптуальныя падыходы да развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2020 года і на перспектыву да 2030 года” адным з асноўных прыярытэтаў нацыянальнай адукацыйнай сістэмы называецца “развіццё інклюзіўнага падыходу ў адукацыі, які дазволіць забяспечыць рэалізацыю права грамадзян на атрыманне якаснай адукацыі і сацыяльную інтэграцыю, што з'яўляецца важным фактарам ўстойлівага развіцця грамадства”.

Нягледзячы на прызнанне інклюзіі ў шырокім сэнсе важным фактарам развіцця сістэмы адукацыі, у дакуменце не ўказана ніводнае мерапрыемства ці тэматычны накірунак, які тычыўся б забеспячэння інклюзіўнасці вышэйшай адукацыі. Пры гэтым пытанні росту коштаў на навучанне з’яўляюцца аб’ектам грамадскага інтарэсу і СМІ штогод спрабуюць атрымаць адказ, чаму кошты ў ВНУ растуць так хутка, але ані ВНУ, ані Міністэрства адукацыі не даюць вычарпальных адказаў, акрамя разважанняў пра рост коштаў на камунальныя паслугі і заробкі выкладчыцкага складу.

Дадзеная аналітычная запіска дыла напісаная як дадатак да Белай кнігі Балонскага працэсу, таму для аналіза была выбраная адна (у некаторых выпадках - дзьве) спецыяльнасць з кожнага з 7 профіляў навучання:
1. Педагогіка (адукацыя).
2. Ахова здароўя.
3. Гуманітарныя навукі.
4. Мастацтва і дызайн.
5. Натуральныя навукі.
6. Камунікацыя. Права. Эканоміка. Кіраванне.
7. Тэхніка і тэхналогіі.

Для аналізу бралася адна спецыяльнасць з профіля, якая існуе ў найбольшай колькасці ВНУ. Кошты на навучанне браліся з афіцыйных сайтаў ВНУ і іх парталаў для абітурыентаў, з кэшыраваных версій афіцыйных сайтаў ВНУ і іх парталаў для абітурыентаў, з аргрэгатараў і рэспубліканскіх парталаў для абітурыентаў (https://kudapostupat.by/ , https://abiturient.by/).

Дадзеныя статыстыкі браліся з БелСтат, НБРБ і дадзеных Сусветнага банку (намінальны ВУП у USD). Для пераводу коштаў з BYN у USD прымяняўся сярэдні курс за студзень-сакавік адпаведнага году па дадзеных НБРБ.

Табліца 1.1. Паказчыкі сярэднямесячнай заработнай платы у BYN і USD, намінальнага Валавага Ўнутранага Прадукта ў BYN (па дадзеных БелСтат) і USD (па дадзеных Сусветнага банку), тэмпы інфляцыі BYN і USD.

| Паказчык | 2018 | 2017 | 2016 |
|---|---|---|---|
| Намінальная налічаная сярэднемесячная ЗП, BYN | 958 | 823 | 723 |
| ВУП на душу насельніцтва, BYN | 12819 | 11133 | 9993 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэмп інфляцыі BYN | 5,60% | 4,60% | 10,60% |
| Намінальная налічаная сярэднемесячная ЗП, USD | 446 | 417 | 378 |
| ВУП на душу насельніцтва, USD | 6290 | 5762 | 5023 |
| Тэмп інфляцыі | 1,90% | 2,10% | 2,10% |

**1. Педагогіка (адукацыя)**
**Спецыяльнасць - 02 03 06 Выкладанне замежных моў**

Табліца 2.1.1. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці “Выкладанне замежных моў”. Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| ВНУ | 2019, BYN | 2018, BYN | 2017, BYN | Δ 17-19, BYN | Δ 17-19, % | Δ 17-18, BYN | Δ 17-18, % | Δ 18-19, BYN | Δ 18-19, % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт | 2640 | 2400 | 2046 | 594 | 29,03% | 354 | 17,30% | 240 | 10,00% |
| Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Скарыны | 2582 | 2358 | 1967 | 615 | 31,27% | 391 | 19,88% | 224 | 9,50% |
| Мозырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. Шамякіна | 2240 | 1950 | 1795 | 445 | 24,79% | 155 | 8,64% | 290 | 14,87% |
| Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 2630 | 2350 | 2000 | 630 | 31,50% | 350 | 17,50% | 280 | 11,91% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **2523** | **2264,5** | **1952** | **571** | **29,25%** | **312,5** | **16,01%** | **258,5** | **11,42%** |

Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БарДУ, а найніжэйшыя - у МДПУ ім. Шамякіна.
У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 29,25% або 571 BYN, найбольшы рост быў зафіксаваны ў ПДУ (31,5% і 630 BYN), найменшы - у МДПУ ім. Шамякіна (24,79% і 445 BYN).
Пры гэтым тэмпы роста запаволіліся: калі ў 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 16,01% і 312,5 BYN, то ў 2018-2019 - 11,42% і 258,5 BYN.

Табліца 2.1.2. Асноўныя дадзеныя пра профіль навучання “Педагогіка” ў 2016-2018 г.г.

| Паказчык | 2018 | 2017 | 2016 |
|---|---|---|---|
| Колькасць студэнтаў/к, чал | 24100 | 25100 | 28200 |
| Колькасць студэнтаў/к, % ад агульнай колькасці | 9 | 8,8 | 9 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, чал | 5800 | 6100 | 5800 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, % ад агульнай колькасці | 9,9 | 9,8 | 9,2 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.1.2., колькасць студэнтаў і студэнтак па профілі “Педагогіка” ў цэлым застаецца стабільнай, і нягледзячы на падзенне агульнай колькасці студэнтаў і студэнтак, на першы курс з кожным годам паступае больш чалавек.

Табліца 2.1.3. Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе, BYN

| **Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе, BYN** | |
|---|---|
| 2019 | 2,63 |
| 2018 | 2,75 |
| 2017 | 2,70 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.1.3., для аплаты навучання ў 2017 г. неабходна было 2,7 сярэднямесячных заробкі, у 2018 г. - 2,75, у 2019 г. - 2,63.

Табліца 2.1.4. Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, BYN

| **Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, USD** | |
|---|---|
| 2019 | 0,1968 |
| 2018 | 0,2034 |
| 2017 | 0,1953 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.1.4., суадношанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва складала ў 2017 г. - 19,53%, у 2018 г. - 20,34%, у 2019 г. - 19,68%.

Статыстыка ў USD

Табліца 2.1.5. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці “Выкладанне замежных моў”. Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| **ВНУ** | **2019, USD** | **2018, USD** | **2017, USD** | **Δ 17-19, USD** | **Δ 17-19, %** | **Δ 17-18, USD** | **Δ 17-18, %** | **Δ 18-19, USD** | **Δ 18-19, %** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт | 1230 | 1216 | 1069 | 161 | 15,05% | 146 | 13,69% | 15 | 1,19% |
| Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Скарыны | 1203 | 1195 | 1028 | 175 | 17,04% | 166 | 16,19% | 9 | 0,73% |
| Мозырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. Шамякіна | 1044 | 988 | 938 | 106 | 11,26% | 50 | 5,29% | 56 | 5,67% |
| Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 1226 | 1190 | 1045 | 180 | 17,25% | 145 | 13,88% | 35 | 2,95% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **1176** | **1147** | **1020** | **156** | **15,24%** | **127** | **12,44%** | **29** | **2,50%** |

Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БарДУ, а найніжэйшыя - у МДПУ ім. Шамякіна.

У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 15,24% або 156 USD, найбольшы рост быў зафіксаваны ў ПДУ (17,25% і 180 USD), найменшы - у МДПУ ім. Шамякіна (11,26% і 106 USD).
Пры гэтым тэмпы роста запаволіліся: калі ў 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 12,44% і 127 USD, то ў 2018-2019 - толькі 2,5% і 29 USD.

Табліца 2.1.6. Суадносанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, USD

| Суадносанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе | |
|---|---|
| 2019 | 0,1869 |
| 2018 | 0,1991 |
| 2017 | 0,2031 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.1.6., суадносанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва ў USD складала ў 2017 г. - 20,31%, у 2018 г. - 19,91%, у 2019 г. - 18,69%.

Такім чынам, па спецыяльнасці "Выкладанне замежных моў" профіля навучання "Педагогіка" за 3 навучальныя гады рост кошту на навучанне склаў каля 30% у BYN, пры інфляцыі за той жа перыяд у 20,8% і росце сярэднямесячнага заробку на 24,5%, або 15,24% у USD пры інфляцыі ў 6,1%. Таксама і ў BYN, і ў USD назіраецца пазітыўная дынаміка адносна суадношання коштаў на навучанне і намінальнага ВУП на душу насельніцтва.

**2. Профіль - Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне.**
**Спецыяльнасць - 25 01 07 Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве.**

Табліца 2.2.1. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве". Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| ВНУ | 2019, BYN | 2018, BYN | 2017, BYN | Δ 17-19, BYN | Δ 17-19, % | Δ 17-18, BYN | Δ 17-18, % | Δ 18-19, BYN | Δ 18-19, % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 3097 | 2799 | 2254 | 843 | 37,40% | 545 | 24,18% | 298 | 10,65% |
| Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт | 2582 | 2464 | 2022 | 560 | 27,70% | 442 | 21,86% | 118 | 4,79% |
| Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт | 3605 | 3278 | 2660 | 945 | 35,53% | 618 | 23,23% | 327 | 9,98% |
| Беларускі гандлева-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі | 2583 | 2400 | 2162 | 421 | 19,47% | 238 | 11,01% | 183 | 7,62% |
| Беларуска-Расійскі ўніверсітэт | 2934 | 2620 | 2296 | 638 | 27,79% | 324 | 14,11% | 314 | 11,98% |
| Брэсцкі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 2596 | 2336 | 1896 | 700 | 36,92% | 440 | 23,21% | 260 | 11,13% |
| Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 2573 | 2298 | 1934 | 639 | 33,04% | 364 | 18,82% | 275 | 11,97% |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Гомельскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт ім. Сухога | 2514 | N/A | 2375 | 139 | 5,85% | | | | |
| Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Скарыны | 2484 | 2358 | 1967 | 517 | 26,28% | 391 | 19,88% | 126 | 5,34% |
| Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Купалы | 3057 | 2139 | 2139 | 918 | 42,92% | 0 | 0,00% | 918 | 42,92% |
| Мінскі інавацыйны ўніверсітэт* | 2968 | 2607 | 2473 | 495 | 20,02% | 134 | 5,42% | 361 | 13,85% |
| Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Кулешова | 3025 | 2637 | NA | | | | | 388 | 14,71% |
| Палесскі дзяржаўны ўніверсітэт | 2495 | 1996 | 1815 | 680 | 37,47% | 181 | 9,97% | 499 | 25,00% |
| Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 2630 | 2350 | 2000 | 630 | 31,50% | 350 | 17,50% | 280 | 11,91% |
| Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва | NA | 2320 | 1750 | | | 570 | 32,57% | | |
| Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці | 2432 | 2090 | 1803 | 629 | 34,89% | 287 | 15,92% | 342 | 16,36% |
| БІП | 2590 | 2065 | 1840 | 750 | 40,76% | 225 | 12,23% | 525 | 25,42% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **2760,30** | **2422,30** | **2086,61** | **673,69** | **32,29%** | **335,70** | **16,09%** | **338,00** | **13,95%** |

Не былі знойдзеныя дадзеныя па коштах на навучанне на адпаведнай спецыяльнасці за 2017 г. - МДУ ім. Куляшова, за 2018 г. - ГДТУ ім. Сухога, за 2019 г. - ПІКП.

Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БНТУ, а найніжэйшыя: у 2017 - ГДТУ ім. Сухога, у 2018 - ПалесДУ, у 2019 - ІПД.

У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 32,29% або 673,69 BYN, найбольшы рост быў зафіксаваны ў ГрДУ ім. Купалы (42,92% і 918 BYN), найменшы - у ГДТУ ім. Сухога (5,85% і 139 BYN).

Пры гэтым тэмпы роста неістотна запаволіліся: калі ў 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 16,09% і 335,7 BYN, то ў 2018-2019 - 13,95% і 338 BYN.

Табліца 2.2.2. Асноўныя дадзеныя пра профіль навучання “Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне” ў 2016-2018 г.г.

| Паказчык | 2018 | 2017 | 2016 |
|---|---|---|---|
| Колькасць студэнтаў/к, чал | 82700 | 90500 | 103900 |
| Колькасць студэнтаў/к, % ад агульнай колькасці | 30,8 | 31,8 | 33,2 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, чал | 18100 | 20200 | 21100 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, % ад агульнай колькасці | 30,8 | 32,6 | 33,6 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.2.2., колькасць студэнтаў і студэнтак па профілі “Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне” павольна зніжаецца і штогод на

спецыяльнасць паступае ўсё менш чалавек. Пры гэтым, сам профіль застаецца адным з найбольшзапатрабаваных і навучаецца на ім каля ⅓ ад агульнай колькасці студэнтаў і студэнтак.

Табліца 2.2.3. Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе, BYN

| **Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе** | |
|---|---|
| 2019-2018 | 2,88 |
| 2018-2017 | 2,94 |
| 2017-2016 | 2,89 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.2.3., для аплаты навучання ў 2017 г. неабходна было 2,89 сярэднямесячных заробкі, у 2018 г. - 2,94, у 2019 г. - 2,88.

Табліца 2.2.4. Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, BYN

| **Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе** | |
|---|---|
| 2019-2018 | 0,2153 |
| 2018-2017 | 0,2176 |
| 2017-2016 | 0,2088 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.2.4., суадносшанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва складала ў 2017 г. - 20,88%, у 2018 г. - 21,76%, у 2019 г. - 21,53%.

Статыстыка ў USD

Табліца 2.2.5. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці “Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве”. Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| **ВНУ** | **2019, USD** | **2018, USD** | **2017, USD** | **Δ 17-19, USD** | **Δ 17-19, %** | **Δ 17-18, USD** | **Δ 17-18, %** | **Δ 18-19, USD** | **Δ 18-19, %** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 1443 | 1418 | 1178 | 265 | 22,51% | 240 | 20,35% | 25 | 1,79% |
| Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт | 1203 | 1248 | 1057 | 146 | 13,85% | 191 | 18,11% | **-45** | **-3,60%** |
| Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт | 1680 | 1661 | 1390 | 290 | 20,84% | 270 | 19,44% | 19 | 1,17% |
| Беларускі гандлева-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі | 1204 | 1216 | 1130 | 74 | 6,52% | 86 | 7,59% | -12 | -0,99% |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларуска-Расійскі ўніверсітэт | 1367 | 1327 | 1200 | 167 | 13,94% | 127 | 10,60% | 40 | 3,02% |
| Брэсцкі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 1210 | 1183 | 991 | 219 | 22,08% | 192 | 19,41% | 26 | 2,23% |
| Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 1199 | 1164 | 1011 | 188 | 18,62% | 153 | 15,16% | 35 | 3,00% |
| Гомельскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт ім. П.Сухога | 1172 | N/A | 1241 | -70 | -5,62% | | | | |
| Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Ф.Скарыны | 1158 | 1195 | 1028 | 129 | 12,59% | 166 | 16,19% | -37 | -3,09% |
| Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я.Купалы | 1425 | 1084 | 1118 | 307 | 27,43% | -34 | -3,08% | 341 | 31,47% |
| Мінскі інавацыйны ўніверсітэт* | 1420 | 1280 | 1280 | 140 | 10,94% | 0 | 0,00% | 140 | 10,94% |
| Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. А.Кулешова | 1410 | 1336 | N/A | | | | | 74 | 5,53% |
| Палесскі дзяржаўны ўніверсітэт | 1163 | 1011 | 949 | 214 | 22,56% | 62 | 6,59% | 152 | 14,99% |
| Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 1226 | 1190 | 1045 | 180 | 17,25% | 145 | 13,88% | 35 | 2,95% |
| Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва | N/A | 1175 | 915 | | | 261 | 28,49% | | |
| Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці | 1133 | 1059 | 942 | 191 | 20,26% | 116 | 12,35% | 75 | 7,05% |
| БІП | 1207 | 1046 | 962 | 245 | 25,50% | 84 | 8,77% | 161 | 15,38% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **1288,68** | **1224,57** | **1089,86** | **198,82** | **18,24%** | **134,71** | **12,36%** | **64,11** | **5,24%** |

Не былі знойдзеныя дадзеныя па коштах на навучанне на адпаведнай спецыяльнасці за 2017 г. - МДУ ім. Куляшова, за 2018 г. - ГДТУ ім. Сухога, за 2019 г. - ПІКП.
Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БНТУ, а найніжэйшыя: у 2017 - ГДТУ ім. Сухога, у 2018 - ПалесДУ, у 2019 - ІПД.
У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 18,24% або 198,82 USD, найбольшы рост быў зафіксаваны ў ГрДУ ім. Купалы (27,43% і 307 USD), было зафіксаванае падзенне кошту - у ГДТУ ім. Сухога (-5,62% і -70 USD). Былі зафіксаваныя і іншыя выпадкі падзення коштаў у USD: у 2018 - у ГрДУ ім. Купалы, у 2019 - у БГЭЎСК і ГДУ ім. Скарыны.
Пры гэтым тэмпы роста значна запаволіліся: калі ў 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 12,36% і 134,71 USD, то ў 2018-2019 - 5,24% і 64,11 USD.

Табліца 2.2.6. Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, USD

| **Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу** | |
|---|---|

| насельніцтва у папярэднім годзе | |
|---|---|
| 2019-2018 | 0,2049 |
| 2018-2017 | 0,2125 |
| 2017-2016 | 0,2170 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.2.6., суадношанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва ў USD складала ў 2017 г. - 21,7%, у 2018 г. - 21,5%, у 2019 г. - 20,49%.

Такім чынам, па спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" профіля навучання "Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне" за 3 навучальныя гады рост кошту на навучанне склаў каля 32% у BYN, пры інфляцыі за той жа перыяд у 20,8% і росце сярэднямесячнага заробку на 24,5%, або 18,24% у USD пры інфляцыі ў 6,1%. Таксама і ў BYN, і ў USD назіраецца пазітыўная дынаміка адносна суадношання коштаў на навучанне і намінальнага ВУП на душу насельніцтва.

**3. Профіль - Ахова здароўя.**

**Спецыяльнасць - 79 01 01 Лячэбная справа.**

Табліца 2.3.1. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці "Лячэбная справа". Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| ВНУ | 2019, BYN | 2018, BYN | 2017, BYN | Δ 17-19, BYN | Δ 17-19, % | Δ 17-18, BYN | Δ 17-18, % | Δ 18-19, BYN | Δ 18-19, % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 3133 | 2780 | 2200 | 933 | 42,41% | 580 | 26,36% | 353 | 12,70% |
| Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 3065 | 2737 | 2164 | 901 | 41,64% | 573 | 26,48% | 328 | 11,98% |
| Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 2625 | 2345 | 1857 | 768 | 41,36% | 488 | 26,28% | 280 | 11,94% |
| Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 3074 | 2745 | NA | | | | | 329 | 11,99% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **2974,25** | **2651,75** | **2073,67** | **867,33** | **41,80%** | **547,00** | **26,37%** | **322,50** | **12,15%** |

Не былі знойдзеныя дадзеныя па коштах на навучанне на адпаведнай спецыяльнасці за 2017 г. у ГрДМУ.

Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БДМУ, а найніжэйшыя ў ГДМУ.

У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 41,8% або 867,33 BYN, найбольшы рост быў зафіксаваны ў БДМУ (42,41% і 933 BYN), найменшы - у ГДМУ (41,36% і 768 BYN).

Пры гэтым тэмпы роста істотна запаволіліся: калі ў 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 26,37% і 547 BYN, то ў 2018-2019 - 12,15% і 322,5 BYN.

Табліца 2.3.2. Асноўныя дадзеныя пра профіль навучання “Ахова здароўя” ў 2016-2018 г.г.

| Паказчык | 2018 | 2017 | 2016 |
|---|---|---|---|
| Колькасць студэнтаў/к, чал | 20300 | 20500 | 20800 |
| Колькасць студэнтаў/к, % ад агульнай колькасці | 7,6 | 7,2 | 6,7 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, чал | 3600 | 3500 | 3600 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, % ад агульнай колькасці | 6,2 | 5,7 | 5,7 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.3.2., колькасць студэнтаў і студэнтак па профілі “Ахова здароўя” прыкладна аднолькавая і штогод на спецыяльнасць прыкладна аднолькавая колькасць чалавек. На фоне зніжэння агульнай колькасці студэнтаў і студэнтак, доля гэтага профіля расце.

Табліца 2.3.3. Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе, BYN

| Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе | |
|---|---|
| 2019-2018 | 3,10 |
| 2018-2017 | 3,22 |
| 2017-2016 | 2,87 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.3.3., для аплаты навучання ў 2017 г. неабходна было 2,87 сярэднямесячных заробкі, у 2018 г. - 3,22, у 2019 г. - 3,10.

Табліца 2.3.4. Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, BYN

| Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе | |
|---|---|
| 2019-2018 | 0,2320 |
| 2018-2017 | 0,2382 |
| 2017-2016 | 0,2075 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.3.4., суадношанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва складала ў 2017 г. - 20,75%, у 2018 г. - 23,82%, у 2019 г. - 23,20%.

Статыстыка ў USD

Табліца 2.3.5. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці “Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве”. Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| ВНУ | 2019, USD | 2018, USD | 2017, USD | Δ 17-19, USD | Δ 17-19, % | Δ 17-18, USD | Δ 17-18, % | Δ 18-19, USD | Δ 18-19, % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 1460 | 1408 | 1150 | 310 | 26,97% | 258 | 22,47% | 52 | 3,67% |
| Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 1428 | 1387 | 1131 | 297 | 26,28% | 255 | 22,58% | 42 | 3,02% |
| Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 1223 | 1188 | 971 | 253 | 26,03% | 217 | 22,39% | 35 | 2,98% |
| Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 1433 | 1391 | NA | | | | | 42 | 3,02% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **1386** | **1343** | **1084** | **287** | **26,43%** | **244** | **22,48%** | **43** | **3,17%** |

Не былі знойдзеныя дадзеныя па коштах на навучанне на адпаведнай спецыяльнасці за 2017 г. у ГрДМУ.
Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БДМУ, а найніжэйшыя ў ГДМУ.
У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 26,43% або 287 USD, найбольшы рост быў зафіксаваны ў БДМУ (26,97% і 310 USD), найменшы - у ГДМУ (26,03% і 253 USD).
Пры гэтым тэмпы роста істотна запаволіліся: калі ў 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 22,48% і 244 USD, то ў 2018-2019 - 3,17% і 43 USD.

Табліца 2.3.6. Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, USD

| **Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе** | |
|---|---|
| 2019-2018 | 0,2204 |
| 2018-2017 | 0,2331 |
| 2017-2016 | 0,2158 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.3.6., суадношанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва ў USD складала ў 2017 г. - 21,58%, у 2018 г. - 23,31%, у 2019 г. - 22,04%.

Такім чынам, па спецыяльнасці “Лячэбная справа” профіля навучання “Ахова здароўя” за 3 навучальныя гады рост кошту на навучанне склаў каля 41,8% у BYN, пры інфляцыі за той жа перыяд у 20,8% і росце сярэднямесячнага заробку на 24,5%, або 26,43% у USD пры інфляцыі ў 6,1%. Таксама і ў BYN, і ў USD адсутнічае стабільная пазітыўная дынаміка адносна суадношання коштаў на навучанне і намінальнага ВУП на душу насельніцтва.

**4. Профіль - Гуманітарныя навукі.**

Табліца 4.1. Асноўныя дадзеныя пра профіль навучання "Гуманітарныя навукі" ў 2016-2018 г.г.

| Паказчык | 2018 | 2017 | 2016 |
|---|---|---|---|
| Колькасць студэнтаў/к, чал | 13300 | 13500 | 14100 |
| Колькасць студэнтаў/к, % ад агульнай колькасці | 4,9 | 4,7 | 4,5 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, чал | 3000 | 3000 | 3000 |
| Прынята студэнтаў/к на 1 курс, % ад агульнай колькасці | 1,7 | 1,6 | 1,8 |

Згодна з дадзенымі табліцы 4.1., колькасць студэнтаў і студэнтак па профілі "Гуманітарныя навукі" зніжаецца ў абсалютных лічбах, але расце ў адсоткавым выражэнні. Колькасць студэнтаў і студэнтак на першым курсе не з'яўляецца стабільнай.

**4.1. Спецыяльнасць - 21 05 06 Рамана-германская філалогія.**

Табліца 2.4.1.1. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці "Рамана-германская філалогія". Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| ВНУ | 2019, BYN | 2018, BYN | 2017, BYN | Δ 17-19, BYN | Δ 17-19, % | Δ 17-18, BYN | Δ 17-18, % | Δ 18-19, BYN | Δ 18-19, % |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | 3514 | 3110 | 2480 | 1034 | 41,69% | 630 | 25,40% | 404 | 12,99% |
| Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Кулешова | 2920 | 2540 | 1946 | 974 | 50,05% | 594 | 30,52% | 380 | 14,96% |
| Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Машэрава | 2898 | 2611 | 2064 | 834 | 40,41% | 547 | 26,50% | 287 | 10,99% |
| Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 2630 | 2350 | 2000 | 630 | 31,50% | 350 | 17,50% | 280 | 11,91% |
| Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Купалы | 3057 | 2139 | 2139 | 918 | 42,92% | 0 | 0,00% | 918 | 42,92% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **3003,80** | **2550,00** | **2125,80** | **878** | **41,31%** | **424,2** | **19,99%** | **453,8** | **18,76%** |

Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БДУ, а найніжэйшыя: у 2017 - МДУ ім. Куляшова, у 2018 - ГрДУ ім.Купалы, у 2019 - у ПДУ.
У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 41,31% або 878 BYN, найбольшы рост быў зафіксаваны ў МДУ ім. Куляшова (50,05%) і ў БДУ (1034 BYN), найменшы - у ПДУ (31,5% і 630 BYN).
Пры гэтым тэмпы росту коштаў засталіся без зменаў: у 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 19,99% і 424,2 BYN, у 2018-2019 - 18,76% і 453,8 BYN.

Табліца 2.4.1.2. Суадносінанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе, BYN

| **Суадносінанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і сярэдняй ЗП у папярэднім годзе** | |
|---|---|

| | |
|---|---|
| 2019-2018 | 3,14 |
| 2018-2017 | 3,10 |
| 2017-2016 | 2,94 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.4.1.2., для аплаты навучання ў 2017 г. неабходна было 2,94 сярэднямесячных заробкі, у 2018 г. - 3,10, у 2019 г. - 3,14.

Табліца 2.4.1.3. Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, BYN

| **Суадносшанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе** | |
|---|---|
| 2019-2018 | 0,2343 |
| 2018-2017 | 0,2290 |
| 2017-2016 | 0,2127 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.4.1.3., суадносшанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва складала ў 2017 г. - 21,27%, у 2018 г. - 22,90%, у 2019 г. - 23,43%.
Статыстыка ў USD
Табліца 2.4.1.4. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці “Рамана-германская філалогія”. Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне

| **ВНУ** | **2019, USD** | **2018, USD** | **2017, USD** | **Δ 17-19, USD** | **Δ 17-19, %** | **Δ 17-18, USD** | **Δ 17-18, %** | **Δ 18-19, USD** | **Δ 18-19, %** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | 1638 | 1575 | 1296 | 341 | 26,33% | 279 | 21,54% | 62 | 3,94% |
| Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Кулешова | 1361 | 1287 | 1017 | 344 | 33,79% | 270 | 26,50% | 74 | 5,76% |
| Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Машэрава | 1351 | 1323 | 1079 | 272 | 25,19% | 244 | 22,61% | 28 | 2,11% |
| Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 1226 | 1190 | 1045 | 180 | 17,25% | 145 | 13,88% | 35 | 2,95% |
| Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Купалы | 1425 | 1084 | 1118 | 307 | 27,43% | -34 | -3,08% | 341 | 31,47% |
| **Сярэдняе значэнне па спецыяльнасці** | **1394** | **1344** | **1109** | **289** | **26,00%** | **181** | **16,29%** | **108** | **9,25%** |

Напрацягу трох навучальных гадоў, найвышэйшыя кошты былі ў БДУ, а найніжэйшыя: у 2017 - МДУ ім. Куляшова, у 2018 - ГрДУ ім.Купалы, у 2019 - ПДУ. У сярэднім за 3 гады кошт навучання павысіўся на 26% або 289 USD, найбольшы рост быў зафіксаваны ў МДПУ ім. Куляшова (33,79% і 344 USD), найменшы - у ПДУ (17,25% і 180 USD).
Пры гэтым тэмпы роста значна запаволіліся: калі ў 2017-2018 навучальным годзе сярэдні рост коштаў склаў 16,29% і 181 USD, то ў 2018-2019 - 9,25% і 108 USD.

Табліца 2.4.1.5. Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе, USD

| **Суадношанне сярэдняга кошту навучання па спецыяльнасці і ВУП на душу насельніцтва у папярэднім годзе** | |
|---|---|
| 2019-2018 | 0,2216 |
| 2018-2017 | 0,2332 |
| 2017-2016 | 0,2209 |

Згодна з дадзенымі табліцы 2.4.1.5., суадношанне кошту на навучанне з ВУП на душу насельніцтва ў USD складала ў 2017 г. - 22,09%, у 2018 г. - 23,32%, у 2019 г. - 22,16%.

Такім чынам, па спецыяльнасці "Рамана-германская філалогія" профіля навучання "Гуманітарныя навукі" за 3 навучальныя гады рост кошту на навучанне склаў каля 41% у BYN, пры інфляцыі за той жа перыяд у 20,8% і росце сярэднямесячнага заробку на 24,5%, або 26% у USD пры інфляцыі ў 6,1%. Таксама і ў BYN, і ў USD адсутнічае стабільная пазітыўная дынаміка адносна суадношання коштаў на навучанне і намінальнага ВУП на душу насельніцтва.

4.2. Спецыяльнасць - 21 03 01 Гісторыя

Табліца 2.4.2.1. Дынаміка коштаў на навучанне па спецыяльнасці "Гісторыя". Абсалютны і адносны рост коштаў на навучанне.

